PolotskSU



полацкія соймікі. Праўда, у першай палове 1702 г. на полацкіх сойміках зацягвалася рашэнне аб паспалітым рушанні на дапамогу Аўгусту II. Само паспалітае рушанне сабралося толькі 23 чэрвеня 1702 г. пад Дольцамі. Сама канфедэрацыя ў падтрымку Аўгуста II была створана на полацкім грамнічным сойміку 1703 г. У 1704 г. сітуацыя стала змяняцца з-за ўваходу ў Полацкае ваяводства на дапамогу «рэспубліканцам» расійскіх войскаў. Фактычна Полацкае ваяводства аказалася пад кантролем расійскіх войскаў, якія аказвалі і непасрэдны ўплыў на функцыянаванне мясцовага сойміка.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. Deputaci Trybunału Głównego Wielkiego Księstwa Litewskiego (1697–1794): Spis / pod red. A. Rachuby ; oprac. A. Rachuba i P.P. Romaniuk przy współpr. A. Macuka, J. Aniszczenki ; Instytut Historii Polskiej Akademii Nauk. – Warszawa : DiG, 2004. – 448 s.
2. Віцько Д. Галоўны Трыбунал ВКЛ 1698 г.: судовая расправа над Сапегамі / Д. Віцько // Архэ. – 2016. – № 3. – С. 84 – 139.
3. Pamiętniki Krzysztofa Zawiszy, wojewody mińskiego (1666–1721). – Warszawa, 1862. – 439 s.
4. Vitsko, Dz. Stanowisko Wiśniowieckich wobec sporów o sejm konny w 1698 roku / Dz. Vitsko// Kultura parlamentarna epoki staropolskiej / red. A. Stroynowski. – Warszawa, 2013. – S. 269–284.
5. Kucharski, T. „Seym ten bez początku zaczął się, bez końca kończy się». Sejm pacyfikacyjny z 1698 roku i jego znaczenie w kontekście ewolucji liberum veto / T. Kucharski // Krakowskie Studia z Historii Państwa i Prawa. – 2019. – № 2. – S. 185–203.
6. Віцько, Д. Дэпутацкія соймікі ВКЛ 1699 г. / Д. Віцько // Архэ. – 2015. – № 12. – с. 164 – 193.
7. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Мінску (НГАБ). Ф. 1734. Воп. 1. Спр. 4.
8. Dybaś, B. Sejm pacyfikacyjny w 1699 r. / B. Dybaś. – Toruń : TNT, 1991. – 273 s.
9. Wićko, D. Kampania przedsejmowa 1699 roku w Wielkim Księstwie Litewskim / D. Wićko // Zapiski Historyczne. – 2014. – T. LXXIX. Z. 2. – S. 29 – 53.
10. НГАБ. Ф. 1734. Воп. 1. Спр. 5.
11. Archiwum Główne Akt Dawnych w Warszawie (AGAD). AR. Dz. V. Sygn. 15677.
12. НГАБ. Ф. 1734. Воп. 1. Спр. 6.
13. НГАБ. Ф. 1734. Воп. 1. Спр. 10.
14. Віцько, Д. Шведскае наступленне 1702 г. у Вялікім Княстве Літоўскім і спроба рэстаўрацыі Сапегаў / Д. Віцько // Архэ. – 2011. – № 6. – С. 8 – 62.
15. Віцько, Д. Зборы паспалітага рушэння шляхты ВКЛ у 1702 г. / Д. Віцько // Вялікае Княства Літоўскае і суседзі: Права. Вайна. Дыпламатыя / пад рэд. С. Сокала, А. Янушкевіча. – Мінск, 2012. – С. 255 – 288.
16. AGAD. Archiwum Radziwiłłów. Dz. XXIII. Teka 20. Plik 4.
17. Burdowicz-Nowicki, J. Piotr I, August II i Rzeczpospolita, 1697–1706 / J. Burdowicz-Nowicki. – Kraków : Arcana, 2010. – 766 s.
18. Urzędnicy Wielkiego Księstwa Litewskiego: spisy. T. V. Ziemia połocka i województwo połockie XIV–XVIII wiek / Pod red. H. Lulewicza; oprac. H. Lulewicz, A. Rachuba, A. Haratym, A. Macuk, A. Radaman, przy współpr. W. Hołubowicza, P.P. Romaniuka. – Warszawa : IH PAN, 2018. – 305 s.
19. НАГАБ. Фонд 1734. Вопіс 1. Справа 7.
20. Великанов, В. Смоленские полки в Великой Северной войне / В. Великанов // Родина. – 2013. – № 9. – С. 53–57.
21. Poraziński, J. Sejm Lubelski w 1703 roku i jego miejsce w konfliktach wewnętrznych na początku XVIII wieku / J. Poraziński. – Warszawa – Poznań – Toruń : Państwowe wydawnictwo naukowe, 1988. – 139 s.
22. НГАБ. Ф. 1734. Воп. 1. Спр. 8.
23. Rachuba, A. Słuszka Dominik Michał / A. Rachuba // Polski Słownik Biograficzny. – T. XXXIX. – Warszawa – Kraków, 1999–2000. – S. 140–144.


## POLOTSK SEIMIKS IN 1697–1704

A. MATSUK

*At the end of the 17th – beginning of the 18th centuries. the Polotsk gentry sided with the "republicans" in their struggle against the Sapiehas. Most of the representatives of the local elite at that time participated in the Polotsk Seimiks. Moreover, the Polotsk ambassadors were active in the s actions of the «republicans» at that time, which made their position no different from the position of other provinces in the east of the Duchy. As it was possible to establish at the head of the Polotsk elite of the "republicans" supporters were the clans of the Nemirovich Shchits, the Zenovichs, the Przysetskys, the Rypinskys, the Pakashs and the Shchit Zabelskys. That is why the Polotsk Seimiks made decisions necessary for the «republicans». The Polotsk gentry remained loyal to August II and local seimiks came out in support of him. As a result, with a certain delay, on June 23, 1702, near Doltsy, they gathered for a pospolitoe rushenie (mobilisation of armed forces) to support Augustus II. The confederation in support of August II was formed at the Polotsk Gromnichny seimik in 1703. In 1704, the conditions for the functioning of local seimiks changed due to the arrival of Russian troops in the Polotsk Voevodstvo to help the «republicans». In fact, the Polotsk Voevodstvo came under the control of Russian troops, which had a direct impact on the functioning of the local seimik.*

***Key words:*** *the Polotsk Voevodestvo (Province), sejmik, Sejm, gentry, noblemen, the Sapiehas, «republicans», confederation.*

УДК 34(091) (476.5)

## ЕЗУІТЫ Ў ГІСТОРЫІ ПАДЗВІННЯ: АСОБЫ і ДАСЛЕДАВАННІ

**Півавар М.В.**
Рэспубліка Беларусь, Віцебск

*У артыкуле разглядаюцца асобы, якія даследавалі гісторыю арганізацыі і дзейнасць сістэмы адукацыі, утвораную езуітамі на Падзвінні (Полаччыне) у XVI – пач. XIX ст. Аналізуецца іх уклад у гісторыю, культуру, адукацыю Полаччыны, асноўныя дасягненні, бібліяграфія. Прыводзяцца звесткі пра найбольш вядомых езуітаў – ураджэнцаў Віцебшчыны, якія атрымалі*

PolotskSU



*адукацыю ў рэгіёне, а далей іх дзейнасць працякала ў іншых месцах. Разглядаюцца таксама і свецкія асобы, якія атрымалі адукацыю ў езуіцкіх навучальных установах і яе ўплыў адчуваўся пэўным чынам на іх дзейнасці. Сярод найбольш вядомы: Ян Баршчэўскі, Балеслаў Брэжга, Аляксей Віктаравіч Бялецкі, Аляксей Парфенавіч Сапуноў, Іван Пятровіч Дэйніс, Францішак Багамолец, Ян Хшціцель Багамолец, Вінцэнцій Бучынскі, Ігнацій Манькоўскі, Гаўдэнтый Шапялевіч і шэраг іншых асоб.*
***Ключавыя словы:*** *езуіты, Полацкі езуіцкі калегіум, Полацкая езуіцкая акадэмія, сістэма адукацыі на беларускіх землях, даследчыкі Падзвіння.*

**Уводзіны.** Езуіты прыйшлі на Падзвінне ў другой палове XVI ст. з тых часоў і да пач. XIX ст. яны адыгрывалі істотную ролю ў гісторыі, культуры і адукацыі паўночных зямель Беларусі. На 1770-я гг. на тэрыторыі ВКЛ было каля 90 езуіцкіх устаноў [1, с. 347], з іх на тэрыторыі Беларусі – больш 70 місій [2, с. 616]. Вакол самых актыўных і буйных утвараліся калегіўмы. На тэрыторыі сучаснай Віцебшчыны яны існавалі ў Полацку, Віцебску, Оршы, Сянно. Большасць шляхты атрымлівалі адукацыю менавіта ў іх.

Полаччыне было наканавана стаць месцам, дзе ў час забароны езуіцкага ордэна у 1773 г. Папам Рымскім ён захаваўся. Тут быў адчынены навіцыят, утворана езуіцкая акадэмія.

У межах нашага артыкула паспрабуем прааналізаваць уклад, які зрабілі езуіты у гісторыі, культуру і адукацыю рэгіёну, а таксама зрабіць кароткі агляд даследчыкаў і даследаванняў, якія вывучалі дзейнасць езуітаў на Полаччыне.

**Асноўная частка**. ***Даследчыкі дзейнсці езуітаў***. Чалавекам, які па роду сваёй дзейнасці правёў вывучэнне маёмасці і спадчыны езуітаў Полаччыны, быў Гіляры **Абрампальскі** (Obrąpolski) (др. палова XVIII – першая пал. XIX ст.). У сувязі з ліквідацыяй “Таварыства Ісуса” на тэрыторыі Рэчы Паспалітай і передачы яго маёмасці Адукацыйнай камісіі, Г. Абрампальскі правёў люстрацыю маёнткаў полацкіх езуітаў на левабярэжнай Полаччыне. У 1774 г. прадставіў у архіў маршалка Міхаіла Іераніма Радзівіла зробленую на 36 старонках люстрацыю 9-ці буйнейшых фальваркаў [3]. Дакумент з’яўляецца каштоўнейшай крыніцай па гісторыі Полаччыны другой паловы XVIII ст. у якім змяшчаюцца статыстычныя матэрыялы і прапановы аўтара па павышэнні даходнасці маёнткаў.

Адным з першых даследчыкаў дзейнасці езуітаў на Полаччыне з’яўляўся даследчык беларускай гісторыі і культуры, бібліёграф, педагог Джордж **Браўн** (Браўн) (у манастве Юзаф; 1.06.1801–31.12.1879). Вучыўся ў езуіцкіх калегіумах Пецярбурга і Полацка. У 1817 г. уступіў у ордэн езуітаў і стаў студэнтам філасофскага факультэта Полацкай езуіцкай акадэміі. Пакінуўшы межы Расійскай імперыі, ён доўгі час выкладаў тэалогію ў езуіцкіх калегіумах Цярнопаля і Львова. Вывучаў гісторыю ордэна езуітаў на Беларусі і ў Польшчы. Стварыў унікальны бібліяграфічны слоўнік на лацінскай мове “Бібліятэка пісьменнікаў польскай часткі таварыства Ісуса” (1856). Туды ўвайшлі звесткі пра ўсіх сяброў ордэна, якія жылі ў 1564–1852 г. на Беларусі, у Літве і Польшчы. Напісаў на лацінскай мове гісторыю езуітаў у Беларусі, у якой шмат матэрыялаў па гісторыі Віцебшчыны (рукапіс не апублікаваны; захоўваецца ў архіве езуітаў у Рыме).

Польскі і беларускі пісьменнік Кароль Антоні **Жэра** (Żera) (1.09.1743, в. Тварагі Выпіхі, Падляшша – пасля 1798) звязаны з Віцебшчынай жыццёвым шляхам і цікавым літаратурным творам, які ўтрымлівае шэраг арыгінальнай інфармацыі па гісторыі і культуры рэгіёна. Доўгі час ён жыў у Сянно [4; 5, с. 39–50; – с. 68–70]. Быў выкладчыкам у мясцовым канвікце (установа кшталту сучаснага інтэрната). Уклаў зборнік беларускіх, польскіх, лацінскіх фацэцый (анекдотаў) “Процьма рэчаў, торба смеху, гарох з капустай, а кожны сабака з іншай вёскі, або Кніга, якая ўключае ў сябе збор розных цікавых і мудрых, дасціпных і забаўных, сэнсоўных і сентыментальных твораў, пытанняў і адказаў, без ладу і ніякага парадку ўкладзеных дзеля выратавальнага павучання, нядаўна распачатае, а да сканчэння свету не завершанае”. Напісаны на лацінскай мове. Распаўсюджваўся ў рукапісах. Уключае ў сябе 233 пацешныя, павучальныя гісторыі, анекдоты (больш паловы ад агульнай колькасці беларускія і запісаны на беларускай мове), якія здарыліся на Лепельшчыне, Сенненшчыне, Полаччыне. Гісторыі насычаны мясцовымі рэаліямі і ўяўляюць цікавасць як крыніца, якая дае магчымасць мець уражанне пра норавы розных слаёў насельніцтва, стан прыгонных сялян XVIII ст. (збіраліся прыкладна ў 1773–1798 гг.). Напрыклад, прыводзіцца цыкл анекдотаў пра полацкага магната Жабу, які быў вядомы сваімі жорсткімі адносінамі да прыгонных.

Удзел у камісіі па разборы езуіцкіх архіваў у 1823 г., браў штатны наглядчык полацкіх народных вучылішчаў А.М. **Дарашкевіч** (кан. XVIII – перш. палова XIX ст.). паведаміў канцлеру Расійскай імперыі М. Румянцаву, што ў гарадскім і павятовым архівах Полацка захоўваюцца старажытныя граматы 400-гадовай даўнасці. У 1825 г. па дазволе канцлера Дарашкевіч і Сышчанка агладалі магістрацкія і павятовыя архівы Віцебска [6, с. 10; 7, с. 47].

Балеслаў **Брэжга** з’яўляўся аўтарам больш 120 друкаваных прац, з якіх каля 30 маюць дачыненне да гісторыі Віцебска і Полацка. з іх езуітам прысвечана работа “Лёс езуіцкіх і гімназічных бібліятэк у Полацку і Віцебску” [8]. У працы “Віцебскія музеі” [9], аўтар прыгадвае, што першыя спробы збіральніцтва і калекцыянавання рабілі езуіты у Віцебску.

Аляксей Віктаравіч **Бялецкі** (1841–1907) служыў з 1879 г. у Віленскай навучальнай акрузе. Займаў пасады настаўніка рускай мовы, дырэктара Полацкай настаўніцкай семінарыі, акружнога інспектара, памочніка папячыцеля акругі. У некаторых сваіх кнігах [10, 11] і артыкулах па пытаннях педагогікі і гісторыі народнай адукацыі аналізаваў яе стан ў краі. У яго працах разглядаюцца асновы арганізацыі вучобы ў навучальных установах піяраў, езуітаў на Беларусі, падрабязна аналізуецца дзейнасць школ Віцебскай і Магілёўскай губ. у канцы XVIII – пач. XIX стст. У яго творах шмат каштоўных звестак па гісторыі народнай асветы на Беларусі. Адзначым, што аўтар стаяў на велікадзяржаўных пазіцыях, не прызнаваў існавання беларускай нацыі і яе культуры [12, с. 161–162].

Гісторык каталіцкай царквы ў ВКЛ Ян Марэк Антоні **Гіжыцкі**, які выступаў пад псеўданімам Валыняк (1844–1925) прысвяціў шэраг прац езуіцкім установам [13. – S. 22–23; 14. – с. 216]. Найбольшую цікавасць з боку гледжання краязнаўства Віцебшчыны выклікаюць некалькі прац, сярод якіх “Нататка пра Акадэмію і школы езуітаў у Полацку” [15] (1899) і праца “Матэрыялы да вывучэння Полацкай акадэміі і залежных ад яе школ” [16]. Апошняя складаецца з 4-х раздзелаў і дадаткаў. Прадстаўлены алфавітны спіс персаналій, мясцовасцяў, важнейшых рэчаў. Першы раздзел “Калегіум у Полацку” складаецца з частак: 1) Сістэма школ езуітаў, 2) Заснаванне і дзейнасць калегіума ў Полацку, 3) Розныя звесткі пра школу езуітаў у Полацку у XVI ст., 4) Некаторыя факты з жыцця школ езуітаў у XVI–XVII стст., 5) Педагагічная дзейнасць Полацкага калегіума у 1800–1812 гг., 6) Спрэчкі езуітаў з Віленскім універсітэтам). Другі раздзел прысвечаны непасрэдна Полацкай акадэміі (С. 57–137). Яго часткі: 1) Адкрыццё акадэміі, 2) Дзейнасць новай установы, 3) Заснаванне новых навуковых устаноў і іх праграмы, 4) Заснаванне школ пры акадэміі, 5) Педагагічны персанал 1813–1820 гг., 6) Агульны спіс полацкага канвікту, 7) Рэктары акадэміі, 8) Далейшы лёс школ у Полацку. Трэці раздзел прысвечаны школам створаным акадэміяй у Полацку: 1) Орша – заснаванне і дзейнасць калегіума, 2) Дынабург, 3) Краслава, 4) Узвальда, 5)

PolotskSU



Віцебск, Магілёў, Чачэрск, Мсціслаў, Астрахань, Адэса інш. У чацвёртым раздзеле змешчана інфармацыя пра выдатных і добра вядомых выхаванцах беларускіх езуітаў.

Краязнаўца, гісторык царквы Іван **Мітрошанка** (мяжа XIX–XX ст.) прысвяціў артыкул "Езуіты ва ўсходняй частцы Беларусі з 1579 да 1772 года" [17], у якім змяшчаецца інфармацыя пра Віцебшчыну, ролю езуітаў у гісторыі Беларусі і Віцебшчыны.

Першы архіварыус Віцебскага цэнтральнага архіва старажытных актавых кніг Аляксандр Міхайлавіч **Сазонаў** (1817–1886) прысвяціў адну з публікацый езуітам [18].

Ролі езуітаў у гісторыі і культуры Прыдзвіння прысвяціў сваю работу вядомы беларускі гісторык, археограф, краязнаўца Аляксей Парфенавіч **Сапуноў** (27.03.1851, м. Усвяты Віцебскай губ. – 2.10.1924, Віцебск). "Заметка о коллегии и академии иезуитов в Полоцке" [19].

Прафесар Пралетарскага універсітэта і Інстытута народнай адукацыі Валер'ян Адольфавіч **Рэйдемейстэр** (Вейгер фон Рейдемейстэр) (кан. XIX – першая трэць XX ст.), З'яўляўся членам губернскай камісіі па ахове даўніны. з мэтай арганізацыі павятовай камісіі ездзіў у Сянно [20, с. 256]. Даследаваў помнікі даўніны горада і наваколляў. На гарышчы касцёла ў Сянно знайшоў бібліятэку езуіцкага кагіума (XVI – пач. XVII ст.), частку якой даставіў у Віцебск (была перададзена ў губернскі музей для разбору) [21].

Вывучэннем спадчыны езуітаў на Полаччыне займаўся педагог, краязнаўца Іван Пятровіч **Дэйніс** (1900–1985). Яго праца "Иезуиты в Полоцке: 1580–1820 гг." [22] была выдадзена ўжо пасля смерці аўтара.

З ліку даследчыкаў канца XX – пачатку XXI ст., якія вывучалі спадчынку езуітаў на Віцебшчыне, прыгадаем Людмілу **Хмяльніцкую**, якая разам з археолагам Ігарам Цішкіным даследавала езуіцкі калегіум у Оршы [23, с. 95–99]. В. **Шайкоў** разглядаў некаторыя аспекты дзейнасці езуіцкай бібліятэкі ў Полацку [24, с. 54–55].

Асобна адзначым тых езуітаў, якія сваёй дзейнасцю пакінулі цікавыя звесткі па гісторыі і культуры Полаччыны.

Аўстрыйскі вучоны-энцыклапедыст, мастак, архітэктар Габрыэль **Грубер** (1740–1805),. Езуіт. Выкладаў прыродазнаўчыя і матэматычныя дысцыпліны ў Полацкім езуіцкім калегіуме. з 1802 г. генерал ордэна езуітаў у Расійскай імперыі [25, с. 157]. Выступіў ініцыятарам стварэння і арганізатар музея Полацкага езуіцкага калегіума. Па праекце Грубера праекце быў пабудаваны трохпавярховы будынак музея, сцены якога аздоблены яго фрэскамі і вучняў калегіума. Аўтар карцін на рэлігійныя тэмы, краявідаў Полацка і яго наваколляў. Пасля смерці частка яго карцін з Полацка і Пецярбурга перавезена езуітамі ў Джорджтаўн (ЗША).

Дэ(с)зідэрый **Рышардот** (Рыхардот) (першая палова XIX ст.), віцэ-рэктар езуіцкага калегіума ў Оршы, рэгент Полацкага канвікту. Па прапанове М. Румянцава, які праязджаючы Оршу не змог адшукаць Рагвалодаў камень, правёў росшукі гэтага помніка эпіграфікі. Адшукаў яго, апісаў і зрабіў малюнак. Памылкова лічыў камень дальменам, які пазней быў скарыстаны як надмагільны камень [26, с. 65].

Чэшскі падарожнік 2-й пал XVIII ст., езуіт Бернгард Леапольд Францішак **Танэр** (Tanner) быў дварэцкім польскага магната М. Чартарыйскага, пасла Рэчы Паспалітай у Расіі (1678). У час падарожжа вёў запісы (выдадзены ў Нюрнберге ў 1689 г.), у якіх пакінуў апісанне гарадоў, стан дарог, прыгоды і здарэнні, што адбыліся з пасольствам. Ехаў праз Дуброўну, Барань, Оршу, Коханава, Талачын. Адзначаў, што Орша пасля вайны 1654–1667 гг. была ў руінах [27, с. 65].

***Выдатныя езуіты – ураджэнцы Віцебшчыны.*** Ураджэнцам Віцебшчыны, які стаў езуітам і зрабіў важкі ўклад у развіццё польскай культуры быў ксёндз, класік польскай літаратуры эпохі Асветніцтва, драматург, публіцыст, выдавец Францішак **Багамолец** (Bohomolec) (1720–1784). Паходзіў з Віцебшчыны. Прымаў актыўны ўдзел у стварэнні польскага Нацыянальнага тэатра ў Варшаве (адчынены ў 1765 г.). Напісаў для яго 20 камедый, оперу і аднаактную камедыю-кантату. Камедыі напісаны пад уплывам творчасці Мальера, Гальдоні і Плаўта. Найбольш вядомы ягоны зборнік "Камедыі". Ён быў ва ўсіх бібліятэках езуіцкіх навучальных устаноў. У сваіх п'есах Ф. Багамолец адлюстраваў сучасную яму рэчаіснасць ("Шлюб па календару" (1766), "Чары" (1775), высмейваў шляхецкае марнатраўства, п'янства, забабоны, любоў да французскай моды, тавараў, гувернёраў і інш. Паказваў жыццё сялян ("Добры пан" (1767). Цэнтральнае месца ў творчасці Багамольца займае п'еса "Аўтар камедыі" (1779). У 1765–1784 гг. выдаваў часопіс "Манітор". Заклікаў драматургаў вучыцца ў Шэкспіра [28, с. 194]. Руплівец на глебе старажытнапольскага пісьменства перавыдаў у 1764 г. "Хроніку Польскую". Ён высока ацаніў яе, чым прывабіў увагу аматараў даўніны з усёй Рэчы Паспалітай; спрабаваў высветліць пытанне аўтарства твора. Збіраў беларускія прыказкі і прымаўкі, якімі хацеў дапоўніць зборнік С. Рысінскага. Працуючы ў варшаўскіх перыядычных выданнях, змяшчаў там матэрыялы з Беларусі.

Прозвішча Багамольца як даследчыка гісторыі і культуры Віцебшчыны згадваў Даніла Васілеўскі ў сваім дакладзе "Беларускі рух на Віцебшчыне" [29]. Але ў надрукаваным у 1-м томе "Віцебшчыны" гэтым дакладзе ягонае прозвішча ўжо адсутнічае [30, с. 210–211].

Яшчэ адным выдатным прадстаўніком Віцебшчыны, які быў езуітам з'яўляўся Ян Хшціцель **Багамолец** (1724–1795). Нарадзіўся на Віцебшчыне, вучыўся ў Празе, варшаўскім Collegium Nobilium. Акрамя прац па матэматыцы і філасофіі, вызначыўся барацьбой з забабонамі і астралогіяй [31, с. 273–274; 32, с. 178]. Аўтар даследавання "Д'ябла ў сваёй выяве", у якім высмейваліся шарлатанства і забабоны шляхты. Сабраныя і змешчаныя ў працы звесткі прадстаўляюць сабой цікавы этнаграфічны матэрыял па прымхам, павер'ям, забабонам мясцовых жыхароў. Напрыклад, аўтар прыводзіць некаторыя з тых рэцэптаў, якімі карысталіся жыхары Віцебшчыны, каб дабіцца ўзаемнасці ў каханні: "Хочаш якую асобу прывязаць да сябе каханнем? Тады насі пры сабе мяса маладога жэрабяці …высушанае ў новым паліваным гаршку ў печы, з якога толькі што хлеб вынялі – калі да якой асобы прыкласці – любіць цябе будзе. Або насі пры сабе валасы з канца воўчага хваста… Або, калі хлеб з пячы вынуць, высушы ўласную кроў, выпушчоную вясной у пятніцу, разам з заечымі ядрамі і вантробай галубіцы разатры на парашок і дай выпіць каханай асобе" [33].

Вядомым навукоўцам, звязаным з Полаччынай з'яўляўся філосаф, тэолаг, крытык Вінцэнцій **Бучынскі** (1789–1853). У 1805–07 гг. вучыўся ў Полацкім езуіцкім калегіуме, дзе атрымаў ступень магістра філасофіі і доктара тэалогіі і некаторы час выкладаў у ім. Да 1820 г. быў выкладчыкам рыторыкі і паэтыкі ў школах пры Полацкай езуіцкай акадэміі ў гарадах Мсціславе, Віцебску, потым прафесарам філасофіі на факультэце вольных, філасофскіх, натуральных і гуманітарных навук, дзе выкладаў натуральнае права, палітычную эканомію і статыстыку. Пасля скасавання Полацкай езуіцкай акадэміі выкладаў філасофію, тэалогію ў розных каталіцкіх навучальных установах Еўропы. Аўтар кнігі "Філасофскія разважанні" (1843–1844). з 1848 г. жыў у Бельгіі. Пакінуў шмат рукапісаў філасофскага і тэалагічнага зместу. У Полацку стварыў першы на Беларусі літаратурна-навуковы часопіс "Miesięcznik Połocki" ("Полацкі месячнік"), быў яго рэдактарам (1818–1820). Забяспечваў друкаванне ў часопісе цікавых матэрыялаў пра Полацк і Полаччыну [34, с. 141–142].

PolotskSU



***Атрымалі адукацыю ў езуіцкіх навучальных установах.*** Беларускі і польскі пісьменнік, этнограф, фалькларыст, выдавец, адзін з пачынальнікаў новай беларускай літаратуры Ян **Баршчэўскі** (1790(94)– 1851) вучыўся ў Полацкім езуіцкім калегіуме. Студэнцкія канікулы найчасцей праводзіў у вандроўках па наваколлі возера Нешчарда. Падарожнічаў па Беларусі, вывучаў побыт і культуру сялян, апісваў курганы, гарадзішчы, запісваў фальклорныя творы, абрады, паданні, легенды, апавяданні, якія лічыў "гісторыяй гэтай зямлі, характару і пачуццяў беларусаў". Быт і культура шырока адлюстраваны ў 4-томным зборніку "Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях" (Т. 1–4) (1844–1846), у "Нарысе паўночнай Беларусі" (1843), ва "Успамінах з наведвання радзімых старон" ("Rocznik literacki", 1844) [35, с. 45; 36, с. 314].

Польскі гісторык антычнай літаратуры, перакладчык Ян **Мігановіч** (1783–1814) вучыўся ў езуіцкіх установах Полацка, Оршы, Віцебска. У 1806–1807 гг. выкладаў у Віцебскай гімназіі, Полацкім езуіцкім калегіуме. Аўтар паэмы "Падарожжа ў Паўночную Расію (з Полацка да Дэрпта)", якая засталася ў рукапісе [37, с. 201].

Публіцыст, асветнік, удзельнік літаратурнага жыцця на Віцебшчыне 1-й трэці XIX ст. Ігнацій **Манькоўскі** (каля 1765–1831) вучыўся "ў езуітаў" (мабыць, у адным з езуіцкіх калегіумаў).

Паэт, педагог Гаўдэнтый **Шапялевіч** (Радзіслаў Іасафатавіч; 1800–1846) скончыў Полацкую езуіцкую акадэмію. Выконваў абавязкі павятовага суддзі, потым служыў у Пецярбургу. Пэўны час займаўся разборам фонду бібліятэкі Полацкай езуіцкай акадэміі. з 1830 г. выкладчык у Віцебскай гімназіі, адкуль быў звольнены ў сувязі са справай Т. Лады-Заблоцкага (1834). На рускай мове напісаў шэраг вершаў у рамантычна-баладным стылі ("Мальвіна" і іншыя) для часопіса "Альманах муз" (1830–1840), празаічныя творы змяшчаў таксама ў часопісе "Вестник Европы". Можна меркаваць, што займаўся вывучэннем гісторыі краю. Г. Шапялевіч – дзед вядомага гісторыка літаратуры і археолага Л.Ю. Лазарэвіча-Шапялевіча [38, с. 472].

**Заключэнне**. Такім чынам, спадчына і роля езуітаў у гісторыі і культуры Прыдзвіння вывучалася шэрагам даследчыкаў, у тым ліку Г. Абрампальскім, Д. Браўнам, Б. Брэжгай, А. Бялецкім, Я.М. Гіжыцкім, І. Мітрошанка, А.М. Сазонавым, А.П. Сапуновым, І.П. Дэйнісам, Л. Хмяльніцкай, В. Шайковым, але вывучана пакуль не дасканала.

Уклад езуітаў у гісторыю і культуру беларускага Падзвіння досыць значны. На працягу XVI – пач. XIX ст. створаная імі сістэма адукацыйных устаноў адыгрывала вялікі ўплыў на павелічэнне адукаванасці насельніцтва, эканамічнае, унутрыпалітычнае, канфесійнае развіццё рэгіёну. Большая колькасць мясцовай шляхты атрымлівала адукацыю менавіта ва навучальных установах езуітаў. Напрыклад, адзін з пачынальнікаў новай беларускай літаратуры Ян Баршчэўскі, гісторык антычнай літаратуры, перакладчык Ян Мігановіч, асветнік, удзельнік літаратурнага жыцця на Віцебшчыне 1-й трэці XIX ст. Ігнацій Манькоўскі, паэт, педагог Гаўдэнтый Шапялевіч.

Узровень выкладання ў навучальных установах ордэну быў досыць высокі дзякуючы прагрэсіўным на той час методыкам, заходнееўрапейскім традыцыям у выкладанні, высокаадукаванаму выкладчыцкаму складу. з Віцебшчыны паходзяць такія вядомыя асобы ў езуіцкім ордэне, як Ф. Багамолец, Я.Х. Багамолец, В. Бучынскі і іншыя. Вывучэнне спадчыны езуітаў на Падзвінні варта працягваць і надалей.

**Спіс выкарыстаных крыніц**[1]


1. Караў, Д. Езуіты / Д. Караў // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. – Т. 3. – 527 с.
2. Вячорка, А. Езуіцкія ўстановы / А. Вячорка // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. Мн.: БелЭн, 2007. – Т. 1. – 632 с.
3. Lustrator Polocki z Dobr Ex iezuickih, ad Archivium J.O. [Jasne Oswicionego] Xcia; Jmci. Radziwilla, Mar. Gener. Konf.: W:X:L. CD (Люстрацыя полацкая паезуіцкай маёмасці, у архіў прывялебнага князя, ягомасці Радзівіла, маршалка генеральнай канфедэрацыі Вялікага княства Літоўскага).
4. Мальдзіс А. Беларусь у люстэрку мемуарнай літаратуры XVIII стагоддзя: Нарысы быту і звычаяў. – Мн.: Маст.літ., 1982. – 232 с.
5. Каранеўская І.М. Літаратурная спадчына манаха Жэры // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Сенненскага раёна. – 654 с.
6. Арсеньев, А.В. Предшественники Витебской ученой комиссии. Из деятельности Н.П. Румянцева по исследованию Витебской старины / А.В. Арсеньев. – Витебск, 1910. – 16 с.
7. Алексеев Л.В. Археология и краеведение Беларуси XVI в. – 30-е годы XX в. – Мн.: "Беларуская навука", 1996. – 206 с.
8. Losy bibljotek jezuickich kolegjów w Połocku i Witebsku // Przegląd Powszechny. – Z. 169. – Kraków, 1925.
9. Muzea Witebskie. Warszawa: Druk. Jan Świętoński I S-ka, Kopernika 34, 1926. – 31 s. // Ziemia. – 1926. – № 15–16.
10. Заботы императрицы Екатерины II о распространении образования в Полоцкой и Могилевской губерниях: [исторический очерк]. Вильна: Тип. А.Г. Сыркина, 1905. – 62 с.
11. Исторический обзор деятельности Виленского учебного округа за первый период его существования, 1803–1832. Отд. 3. – Вильна, 1906.
12. Рыбко, М.Я. Бялецкі А.В. / М.Я. Рыбко // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. – Т. 2. – 537 с.
13. Polski słownik biograficzny. – Warszawa, 1959. – T. 8, z. 36.
14. Канаплёва, с. Валыняк / С. Канаплёва // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. – Т. 2. – 537 с.
15. Natatka o Akademii i szkolach jezuitow w Polocku. – Poznan, 1899.
16. Matriały do dziejów Akademii Połockiej i ziem szkól od niej zależnych. Zebrał I.G. Kraków: Druk.W.L.Anczyca i Spółki, 1905. – 288 s.
17. Езуиты в Восточой части Белоруссии с 1579 до 1772 года // Полоцко-Витебская старина. – Вып. 2. – Витебск, 1912. – С. 1–120.
18. Опись церковных и монастырских имений Полотского воеводства отданных королем Стефаном Баторием Полоцкой иезуитской коллегии, при основании оной. Составлена Скуминым-Тышкевичем. Перевод с польского // Памятная книга Витебской губернии на 1867 г. – Витебск, 1868. – С. 99–121.
19. Сапунов, А.П. Заметка о коллегии и академии иезуитов в Полоцке / А.П. Сапунов. – Витебск, 1890. – 34 с.
20. Витебск. Классика и авангард. История Витебского художественного училища в документах Государственного архива Витебской области (1918–1923). – Витебск, 2001. – 336 с.
21. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці. – Ф. 1947. Воп. 1. Спр. 5. Арк. 79.
22. Иезуиты в Полоцке: 1580–1820 гг. В 2 ч. Ч. 1 / Сост., примеч. и вступ. ст. Л.Ф. Данько, А.И. Судник. – Полоцк: А.И. Судник, 2005. – 40 с.


[1] Спіс выкарыстаных крыніц і літаратуры падаецца ў аўтарскай рэдакцыі.

PolotskSU



23. Хмяльніцкая, Л.П. Аршанскі езуіцкі калегіўм / Л.П. Хмяльніцкая // Памяць: Гісторыка-культурная хроніка Оршы і Аршанскага раёна: у 2 кн. – Кн. 1. – Мн.: БелЭн, 1999. – 384 с.
24. Шайкоў, В. Да пытання аб езуіцкай бібліятэцы ў Полацку / В. Шайкоў // Беларускі гістарычны часопіс. – 2003. – № 4. – 123 с.
25. Шалькевіч, В. Грубер Г. / В. Шалькевіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. – Т. 3. – Мн., 1996. – 537 с.
26. Каханоўскі, Г.А. Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі ў XVI–XIX стст. / Г.А. Каханоўскі. – Мн.: Навука і тэхніка, 1984. – 120 с..
27. Грыцкевіч, В. Шляхі вялі праз Беларусь / В. Грыцкевіч, А. Мальдзіс. – Мн.: Мастацкая літаратура, 1980. – 271 с.
28. Русецкі, А.У. Художественная культура Витебска с древности до 1917 года. / А.У. Русецкі, Ю.А. Русецкі. – Мн.: БелЭн., 2001. – 288 с.
29. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці. – Ф. 1947. Воп. 15. Спр. 88.
30. Васілеўскі, Д. Беларускі рух на Віцебшчыне / Д. Васілеўскі // Віцебшчына. 1927. – Т. 1. 220 с.
31. Мальдзіс, А. Беларусь у люстэрку мемуарнай літаратуры XVIII стагоддзя: Нарысы быту і звычаяў. Мн., 1982. – 256 с.
32. Пачынальнікі: з гіст.-літар. матэрыялаў XIX ст. / Укладальнік Г.В. Кісялёў. – 2-е выд. Мн., 2003. – 549 с.
33. Bohomolec Jan. Djabeł w swojej postaci. Warszawa, 1775, cz. I. – S. 366–369.
34. Шалькевіч, В.Ф. Бучынскі В. / В.Ф. Шалькевіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. – Т. 2. – 537 с.
35. Каханоўскі, Г.А. Вандраванні / Г.А. Каханоўскі // Маладосць. – 1984. – № 10..
36. Мальдзіс, А.В. Баршчэўскі Я. / А.В. Мальдзіс // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. – Т. 1. – 494 с.
37. Кулажанка, Л. Літаратурныя мясціны Беларусі / Л. Кулажанка, А. Мальдзіс, с. Сачанка. – Кн.1. – 288 с.
38. Шапялевіч, Г. // Асветнікі зямлі Беларускай: Энцыкл. давед. / Рэдкал.: У.М. Жук. – Мн.: БелЭн, 2001. – 496 с.

**JESUITS IN HISTORY OF PADZVINNE: PERSONS AND STUDIES**

M. PIVAVAR

*The article examines the person who explore the history of the organization and activities of the education system, formed by the Jesuits in Polotsk region XVI – beginning of XIX century. It analyzes their contribution to the history, culture, education Polotchiny, major achievements, bibliography. It provides information about the most famous Jesuit – who were born in modern Vitebsk region, who received their education in the region, and further their work proceeded elsewhere. There are about secular persons, who were educated in Jesuit schools, and was influenced by their activities. Among the best known: Ian Borshevsky Boleslav Brezhga, Alexey Beletsky, A.P. Sapunov, I.P. Deynis, F. Bahampolec, J.H. Bahampolec, V. Buchinskiy, I. Mankovsky, G. Shepelevich and a number of others.*
***Key words:*** *Jesuits Polotsk Jesuit College, Polotsk Jesuit Academy, the education system in the Belarusian lands, the researchers of Polotsk region.*

УДК 940:37

## СИСТЕМАТИЧЕСКИЙ АНАЛИЗ КНИЖНОГО ФОНДА ПОЛОЦКОГО ИЕЗУИТСКОГО КОЛЛЕГИУМА: КНИГИ ПО ИСТОРИИ, ИЗДАННЫЕ В XVII-XVIII ВВ.

**Стройлова Е.С.**
Республика Беларусь, Минск

*Предметом рассмотрения в статье являются книги по истории, которые были изданы в типографии Полоцкого иезуитского коллегиума во второй половине XVIII в. и других отечественных и заграничных типографиях в XVII-XVIII вв., и находились в библиотеке Полоцкого коллегиума. Книжные каталоги Национальной библиотеки Беларуси и Центральной научной библиотеки имени Я. Коласа НАН Беларуси использовались качестве основного источника для написания статьи. В статье предлагается классификация книг по содержанию, уточняется время и место их издания. Тема актуальна, так как в белорусской историографии нет работ по данной проблематике.*
***Ключевые слова:*** *библиотека, Великое княжество Литовское, история, книга, полоцкая типография, Полоцкий иезуитский коллегиум, Речь Посполитая.*

Культурная ситуация на белорусских землях Речи Посполитой в XVII-XVIII вв. была сложной. Католическая и Греко-католическая (униацкая) Церкви осуществляли политику окатоличивания православного населения, польское правительство продолжало полонизацию Великого княжества Литовского. Совеременный белорусский исследователь Н.Ю. Березкина пишет: «Со второй половины XVII в. книгопечатание Беларуси вступило в полосу затяжного кризиса, который совпал с общим социально-экономическим кризисом Речи Посполитой. […] Белорусский язык и культура, которые на протяжении многих столетий занимали лидирующее положение в Великом княжестве Литовском, с конца XVII в. постепенно сдают свои позиции» [1]. Из 12 типографий, которые функционировали на территории современной Беларуси в XVIII в., ни одна не издавала книги на белорусском языке. Закрывались братские школы, создавалась сеть католических высших учебных заведений. Одной из них была Полоцкая иезуитская коллегия.

Рассматриваемая статья посвящена обзору книг по истории, которые издавались в типографии Полоцкой иезуитской коллегии и других, отечественных и заграничных типографиях в XVII-XVIII в., и поступали в библиотеку Полоцкой коллегии. В качестве основного источника нами были взяты каталоги книг Национальной библиотеки Беларуси и Центральной научной библиотеки имени Я. Коласа НАН Беларуси. Тема актуальна, так как анализ предложенных книг по истории позволяет составить представление об интересе элиты полоцкого государства к отечественной, всемирной и церковной истории.

В результате исследования библиотечных фондов Центральной научной библиотеки имени Я. Коласа НАН Беларуси (12), данных научной статьи «Книги из библиотек иезуитских коллегиумов Полоцка, Новогрудка, Слуцка, Несвижа в польском разделе Славянского фонда БАН» [2] современного исследователя Комиссаровой Е.В. (7) и прочей литератруры (3) были выявлены и классифицированы книги по истории, хранившиеся в библиотеке Полоцкой академии:

PolotskSU

МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«ПОЛАЦКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ»

# БЕЛАРУСКАЕ ПАДЗВІННЕ: ВОПЫТ, МЕТОДЫКА і ВЫНІКІ ПАЛЯВЫХ І МІЖДЫСЦЫПЛІНАРНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ

Зборнік артыкулаў
V міжнароднай навуковай канферэнцыі
(Полацк, 15–16 красавіка 2021 г.)

Пад агульнай рэдакцыяй
канд. гіст. навук, дац. А.І. Корсак;
канд. гіст. навук В.У. Чараўко;
канд. гіст. навук, дац. У.Я. Аўсейчыка

Наваполацк
Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт
2021

PolotskSU

УДК 343.13(063)
ББК 67.410.2я431

Рэкамендаваны да выдання саветам гуманітарнага факультэта
Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта (пратакол № 3 ад 29.03.2021)

*Рэдакцыйная калегія:*

*А.І. Корсак,* канд. гіст. навук, дац. (адк. рэд.), заг. каф. гісторыі і турызму Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта;
*В.У. Чараўко,* канд. гіст. навук, дац. каф. гісторыі і турызму Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта;
*У.Я. Аўсейчык,* канд. гіст. навук, дац., дац. каф. гісторыі і турызму Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*Рэцэнзенты:*

*С.В. Кулінок,* канд. гіст. навук, заг. аддзела публікацый Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь;
*Т.А. Джумантаева,* канд. культуралогіі, дац., дырэктар Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка.

**Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў :** зб. арт. V міжнар. навук. канф., Полацк, 15–16 крас. 2021 г. / Полац. дзярж. ун-т ; пад агульн. рэд. А.І. Корсак (адк. рэд.), В.У. Чараўко, У.Я. Аўсейчыка. – Наваполацк : Полац. дзярж. ун-т, 2021. – 272 с.
ISBN 978-985-531-737-2.

У зборніку змешчаны навуковыя артыкулы па выніках работы V міжнароднай навуковай канферэнцыі “Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў”. Прадстаўлены вынікі антрапалагічных і археалагічных даследаванняў Беларускага Падзвіння і сумежных тэрыторый. Прыведзены новыя даныя аб гістарычных лёсах, матэрыяльнай і духоўнай спадчыне рэгіёна Паўночнай Беларусі ў шырокім храналагічным кантэксце (ад першабытных часоў да сучаснасці).

Разлічаны на прафесійных гісторыкаў, археолагаў, этнолагаў, антраполагаў, мастацтвазнаўцаў, студэнтаў гістарычных спецыяльнасцей ВНУ, краязнаўцаў і ўсіх, хто цікавіцца гісторыяй Беларусі.

**УДК 343.13(063)**
**ББК 67.410.2я431**

**ISBN 978-985-531-737-2**

© Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт, 2021

PolotskSU

*Навуковае выданне*

**БЕЛАРУСКАЕ ПАДЗВІННЕ:**
**ВОПЫТ, МЕТОДЫКА і ВЫНІКІ ПАЛЯВЫХ**
**І МІЖДЫСЦЫПЛІНАРНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ**

Зборнік артыкулаў
V міжнароднай навуковай канферэнцыі
(Полацк, 15–16 красавіка 2021 г.)

Адказны рэдактар *А. І. Корсак*

Тэхнічнае рэдагаванне і камп'ютарная вёрстка
*І. М. Чапкевіч*
Дызайн вокладкі *М. С. Мухаморавай*

Падпісана да друку 20.05.2021. Фармат 60×84 $^{1}/_{8}$. Бумага афсетная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 31,63. Улік.-выд. арк. 32,96. Тыраж 70 экз. Заказ 810.

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі «Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт».

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі
выдаўца, вырабніка, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№ 1/305 ад 22.04.2014.

ЛП № 02330/278 ад 08.05.2014.

Вул. Блахіна, 29, 211440, г. Наваполацк.